# БАРАВІКОВА РАІСА

Дазвольце мне вярнуцца з лістападу, З завеі ці з дажджу ў будзённы час, каб доўг аддаць у глыбіню пагляду, – замоўчанае: "Я КАХАЮ ВАС..."



- Баравікова Раіса, нарадзілася 11.05.1947 г. у вёсцы Пешкі Бярозаўскага раёна Берасцейскай вобласці ў сям'і служачага.



- З імем гэтай паэткі, нават з яе нязменна прыгожым праз многія гады знешнім воблікам і голасам, звязана ўражанне прасветленасці, пяшчоты, рамантычна-ўзнёслых адносін да жыцця, эмацыянальнасці і высокай усхваляванасці, якая не можа стрымлівацца ніякімі побытавымі межамі.




- Такая яна і ў сваёй творчасці, да якой можна без залішняй аглядкі на ўмоўнасць тэрміну прымяніць эпітэт жаночая паэзія. Азначэнне гэтае ў дадзеным выпадку мае высокае ацэначнае значэнне, бо творчасць Р. Баравіковай вызначаецца выразным гуманістычным пафасам, высакароднасцю і мудрасцю, эстэтычнай змястоўнасцю і разнастайнасцю.



- Працуючы ў межах традыцыйнай беларускай паэзіі, якая грунтуецца на фальклорнай аснове, класічным сілаба-танічным рыфмаваным вершы-маналогу, Раіса Баравікова здолела стварыць адметны лірычны характар, раскрыць глыбіні чалавечай душы ў яе разнастайных праявах.



- . Працавала літсупрацоўнікам у Быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя». Скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута ў Маскве (1971). Працавала рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» (1971—1972). У 1972—77 — карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва», у 1983—88 — літкансультант рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1996—2000 гадах намеснік, у 2000—2002 гадах галоўны рэдактар часопіса «Алеся». Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» (2002—2011 ). Супрацоўніца газеты «Літаратура і

# РАМОНКАВЫ БЕРАГ 1974 ГОД




- Аўтар з цяплом і пранікнёнасцю піша аб роднай Беларусі, аб добрым праменным свеце чалавечых узаемаадносін, аб дружбе і каханні. Уражанні юнацтва, роздум аб сэнсе жыцця, аб пошуках свайго месца ў ім робяць вершы Баравіковай цікавымі і запамінальнымі.

# ТАКОЕ КАРОТКАЕ ЛЕТА 1981




- «Такое кароткае лета» — трэцяя кніга вершаў Раісы Баравіковай. Яе склалі вершы апошняга часу. Кніга складаецца з двух раздзелаў. У першым — роздум лірычнай гераіні пра час, пра чалавечы абавязак перад Радзімай, сваім народам. У другім — доля жанчыны, пошук чалавечага шчасця, уменне распарадзіцца ім. Сюды ўвайшлі вершы інтымна-лірычнага плану, ёсць тут чаканне і

# АДГУКНУСЯ ГОЛАСАМ ЖАЛЕЙКІ 1984




- Сама назва лірычнай кнігі гаворыць пра яе накіраванасць — «Адгукнуся голасам жалейкі». Душа паэтэсы адгукаецца на покліч Радзімы, прыроды, чалавека блізкага і далёкага, дзіцяці, каханага, на покліч будучыні. Калі б я знала, што — ў гадах? — была б да ўчынкаў асцярожнай, ды нават слова па складах раскласці не заўсёды можна. Калі б я знала,— дзе? Калі? — узнікне тая агароджа зямлі, дзе ўжо няма зямлі,— не пражыла б і дня, быць можа. Кал і б я знала, што няма душы, каб мне душой прыпасці, я не чакала б, я сама сабе адмовіла б у шчасці!

# ГАЛЕНЧЫНЫ «Я», АЛЬБО ПЛАНЕТА ЦІКАЎНЫХ ХЛОПЧЫКАЎ 1990




- У фантастычнай аповесці расказваецца аб тым, як у неабсяжным і загадкавым Космасе жыхары планеты Цікаўных Хлопчыкаў нечакана адкрываюць новую планету Блакітная Зорка, на якой жыве дзяўчынка Галенка. Яна расказвае хлопчыкам гісторыі і казкі пра самыя цудоўныя чалавечыя якасці.

# ЛЮСТЭРКА ДЛЯ САМОТНАЙ 1992




- У гэтай кнізе чытач знойдзе радкі: «Мне так шкада, што неўзаметку гады Афеліі прайшлі...» Жыццё рухаецца, і хто як не жанчына ўсёй сваёй трапяткой прыродай адчувае гэты няўтольны, а часам жорсткі рух. Мінаецца маладосць, і ўсё большае смутку. Сама назва зборніка адлюстроўвае гэты праўдзівы смутак, шчыры жаль.

# ПАД НЕБАМ ПЕРШАГА СПАТКАННЯ 1990




- Раіса Баравікова — адна з самых яркіх прадстаўніц паэзіі яе пакалення. Нястрымная страснасць яе ранніх інтымных вершаў у апошні час спалучаецца з унутранай стрыманасцю, не губляе пры гэтым сілы пачуццяў і глыбіні разумення жыцця. У кнізе сабрана лепшае з творчага багажу паэтэсы. лаўрэата

# ДЗВЕ АПОВЕСЦІ ПРА МІЖПЛАНЕТНАГА ПАЖАРНІКА І КАЗКА ПРА ЖАБЯНЯ КВЫШ-КВЫШ 1996



- Завуць яго мамурык. І шукаць яго трэба на планеце Мамурыя, дзе заўсёды жылі і, напэўна, жывуць і цяпер — мамуры. Да гэтага трэба дадаць яшчэ адно.

# САД НА КАПЯЛЮШЫКУ КАХАНАЙ 1997




- Усім вядомы біблейскі сюжэт: Бог стварыу райскі сад, пасяліў у ім Адама і Еву… Еву спакусіў Гад, пасля чаго забаронены плод пакаштаваў і Адам, але гаворка ў дадзеным выпадку не пра грэх, а пра тое, што на Зямлі ў кожнага з нас ёсць свой сад.

# ВЯЧЭРА МАНЕКЕНАЎ 2002




- Апавяданні гэтага зборніка напісаны ў жанры псіхалагічнай фантастыкі. Калі чалавеку пачынае надакучаць будзённая аднастайнасць зямнога свету ён шукае у сваіх думках снег паралельны. Менавіта гэты, паралельны, свет пісьменніца Раіса Баравікова вельмі арганічна ўпісвае ў свае творчыя фантазіі.

# ДРЭВА ДЛЯ РАЙСКАЙ ПТУШКІ 2007




- Кніга лірыкі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, вядомай пісьменніцы Раісы Баравіковай «Дрэва для райскай птушкі» — гэта вынік шматгадовай працы ў літаратуры тонкага лірыка, філосафа, грамадскага дзеяча і проста жанчыны, якая кахае і хоча быць каханай.

# КАЗКІ З ГЕРБАРЫЯ 2008




- расказвае пра займальныя прыгоды фантастычна-казачнага героя Мупсякарнашжабулвака, які сам сябе называе вельмі коратка — Мупся. Ён — нябачны чалавечаму воку, і яго можна ўявіць кім заўгодна, нават чараўнікам, таму што Мупся здатны на неверагодныя ўчынкі, але галоўнае не гэта.

# АДЗІНОКІ ВАСЬМІКЛАСНІК ХОЧА ПАЗНАЁМІЦЦА 2008




- Пра далікатныя пачуцці расказваецца і ў аповесці Раісы Баравіковай «Казімір — сын Ягайлы + Насця з 8 «Б» = », але гэта пачуцці ўжо іншага кшталту. Прышэльцы з іншасвету знаходзяць у дзяўчыне Насці Кропку вяртання, якую ў шмат каго сцерла ці парушыла цывілізацыя.

# ЖЫВАЯ ЧЫТАНКА / РАІСА БАРАВІКОВА / ВЕРШЫ 2008



# ВЯРТАННЕ 2009



# КАЗАЧНЫЯ АПОВЕСЦІ ПРА МІЖПЛАНЕТНАГА ПАЖАРНІКА І ІНШЫХ МАМУРЫКАЎ 2010




- Мамурык — з далёкай планеты Мамурыі, каго адна знаёмая дзяўчынка пісьменніцы Раісы Баравіковай, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь назвала міжпланетным Пажарнікам, даўно спадабаўся юным чытачам. Новая кніга атрымала назву «Казачныя аповесці пра міжпланетнага Пажарніка і іншых мамурыкаў».

# КАЗКІ АСТРАНАЎТА 2011




- Дзівосны, заманлівы і таемны свет далёкіх планет адкрыецца чытачу і, безумоўна, захопіць не толькі неверагоднымі прыгодамі герояў кнігі, але і цікавымі звесткамі пра асобныя зоркі і нават цэлыя сузор'і. Пісьменніца ўдала спалучае поўны нечаканасцей свет чужых планет з блізкім і родным светам нашай планеты, дзе, зразумела, самыя прыгожыя і добрыя пачуцці звернуты да Беларусі.

# ЛАЎРЭАТ ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ СП БССР ІМЯ А.КУЛЯШОВА (1988) ЗА КНІГУ ЛІРЫКІ «КАХАННЕ».



ДЗЯКУЙ

ЗА

ЎВАГУ